# Дысграфія: характарыстыка формаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Склала:**
**выкладчык**
**кафедры лагапедыі БДПУ**
**Лагун Т.Т.**

# Дысграфія -

гэта частковае парушэнне працэсу пісьма, якое выяўляецца ў устойлівых, паўтаральных памылках, абумоўленых несфармаваннасцю вышэйшых псіхічных функцый, якія ўдзельнічаюць у працэсе пісьма.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Згодна з сучасных даследаванняў Л.Р.Парамонавай,

*дысграфія* маецца ў 53% навучэнцаў другіх класаў.

Асобныя ж яе віды прадстаўлены наступным чынам:

- акустычная і артыкуляцыйна-акустычная дысграфія – 10,7 %;
- дысграфія на глебе несфармаваннасці моўнага аналізу і сінтэзу – 42,1 %;
- аграматычная дысграфія – 5,6 %;
- аптычная дысграфія – 1,3 %.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Характарыстыка формаў дысграфіі

Найбольш абгрунтаванай з'яўляецца класіфікацыя дысграфіі, у аснове якой ляжыць несфарміраванасць пэўных аперацый працэсу пісьма *(распрацавана супрацоўнікамі кафедры лагапедыі ЛДПІ ім. А. І. Герцэна).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Вылучаюцца наступныя формы дысграфіі:

- артыкуляцыйна-акустычная дысграфія,
- дысграфія на аснове парушэння фанемнага распазнавання (акустычная дысграфія),
- дысграфія на глебе несфармаваннасці моўнага аналізу і сінтэзу,
- аграматычная дысграфія ,
- аптычная дысграфія .

Дадзеная класіфікацыя выкарыстоўваецца сучаснымі лагапедамі-практыкамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Артыкуляцыйна-акустычная дысграфія

Выдзелена ***М. Я. Хватцавым.***

***Механізмам*** гэтай формы дысграфіі з'яўляецца ***няправільнае вымаўленне гукаў мовы, якое адлюстроўваецца на пісьме:***

дзіця піша словы так, як іх вымаўляе.

***Сімптомы: змешванне, замены, пропускі літар***, якія адпавядаюць змешванням, замянам, адсутнасці гукаў у вуснай мове.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Дысграфія на аснове парушэння фанемнага распазнавання (акустычная дысграфія)

***Механізм*** гэтай формы дысграфіі звязаны з ***недакладнасцю слыхавай дыферэнцыяцыі гукаў***, пры гэтым вымаўленне гукаў з'яўляецца нармальным.

***Сімптомы: замены і змешванне літар***, якія абазначаюць фанетычна блізкія гукі, ***парушэнне абазначэння мяккасці зычных на пісьме*** (свісцячыя-шыпячыя, звонкія-глухія і інш.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Дысграфія
# на глебе несфармаваннасці моўнага аналізу і сінтэзу

***Механізмам*** гэтай формы дысграфіі з'яўляецца ***парушэнне наступных формаў моўнага аналізу і сінтэзу:*** аналізу сказаў на словы, складовага і фанематычнага аналізу і сінтэзу.

***Сімптомы: злітнае напісанне слоў у сказе,*** асабліва прыназоўнікаў; ***паасобнае напісанне слоў,*** асабліва прыстаўкі і кораня; ***скажэнне гукалітарнай структуры слова*** (пропускі зычных пры іх збегу, пропускі галосных, перастаноўка літар, даданне літар, пропускі, дадання, перастаноўкі складоў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Аграматычная дысграфія

***Механізмам*** гэтай формы дысграфіі з'яўляецца ***несфармаваннасць лексіка-граматычнага ладу маўлення.***

***Сімптомы: марфалагічны аграматызм*** (парушэнне функцыі словаўтварэння: недарэчнае ўжыванне суфіксаў, прыставак, словаформ), ***сінтаксічны аграматызм*** (адсутнасць абазначэння межаў сказаў: загалоўных літар і кропак; парушэнне сувязі слоў у сказе: ўзгадненне і кіраванне - парушэнні змены слоў па катэгорыях ліку, роду, склону, часу; цяжкасці ўжывання прыназоўнікаў: замены, пропускі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Аптычная дысграфія

***Механізм*** гэтай формы дысграфіі звязаны ***з несфармаванасцю зрокава-прасторавых функцый:*** зрокавага гнозісу, зрокавага мнэзіса, зрокавага аналізу і сінтэзу, прасторавых уяўленняў.

***Сімптомы: скажоная перадача літар на пісьме*** (няправільная перадача прасторавых суадносін літарных элементаў, недапісванне элементаў літар, лішнія элементы літар, люстраное напісанне літар); ***замены і змешванні графічна падобных літар*** (п-т, л-м, в-д, э-с і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Літаратура:

1. Лалаева, Р.І., Венедіктава, Л.В. Дыягностыка і карэкцыя парушэнняў чытання і пісьма ў малодшых школьнікаў / Р.І.Лалаева, Л.В. Венедіктава . - СПб.: Саюз, 2001.
2. Лагапедыя / Пад рэд. Л.С. Волкавай. – М.: ВЛАДАС, 2007.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ